**УДК 351.853.3(476.5)+904:726.82(476.5)«14/15»**

# РАСКОПКІ НА МОГІЛЬНІКУ КАЛЯ ВЁСКІ ІВЕСЬ ГЛЫБОЦКАГА РАЁНА Ў 2013 ГОДЗЕ

***В.У. ЧАРАЎКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Апісваюцца археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2013 г. Мэтай раскопак быў працяг вывучэння пахавальных помнікаў, пачатага ў 2010 г. Ускрытая ў 2013 г. плошча склала 36 м$^2$. Адзначаецца, што стратыграфія раскопа 2013 г. суадносіцца са стратыграфіяй шурфоў і раскопаў 2010–2012 гг. Было даследавана 7 пахаванняў (3 мужчынскіх, 2 дзіцячых; 2 пахаванні належалі дарослым, пол якіх не быў устаноўлены). Пахаванні былі пазначаны каменнымі надмагільнымі канструкцыямі. Касцякі арыентаваны галавой на паўночны захад (што фіксуецца на могільніку каля вёскі Івесь упершыню) і на захад з адхіленнем да поўначы. У чатырох пахаваннях знойдзены цвікі ад трун. Робіцца выснова, што выяўлены ў дзіцячым пахаванні інвентар (2 завушніцы) датуецца XV–XVI стст.*

***Ключавыя словы:*** *Беларускае Падзвінне, археалагічныя даследаванні, пахавальныя помнікі XV–XVI стст., пахавальны інвентар, пахаванні.*

**Уводзіны.** Пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. параўнальна нядаўна сталі прадметам мэтанакіраваных даследаванняў. Познесярэднявечныя могільнікі, асабліва вясковыя, застаюцца недастаткова вывучанай катэгорыяй археалагічных аб’ектаў. Іх адметнасцю з’яўляецца безынвентарнасць пераважнай большасці пахаванняў, што ўскладняе датаванне могільнікаў, рэканструкцыю матэрыяльнай культуры і пахавальнай практыкі познесярэднявечнага насельніцтва [1, с. 20–21; 2, с. 25–26]. Вывучэнне познесярэднявечных могілак, асабліва вясковых, з’яўляецца перспектыўным напрамкам археалагічных даследаванняў.

Могільнік каля в. Івесь Псуеўскага сельсавета Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці знаходзіцца на заходнім беразе возера Івесь, паміж возерам і дарогай з в. Івесь у в. Шо. Інфармацыя аб могільніку атрымана ў 2009 г. ад дацэнта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, канд. гіст. навук Уладзіміра Аляксандравіча Лобача. У тым жа годзе на помніку былі праведзены візуальныя разведкі. Была зафіксавана наяўнасць чатырох каменных крыжоў і ямы ад несанкцыянаваных раскопак. У 2010, 2011 і 2012 гг. на могільніку намі праводзіліся археалагічныя даследаванні [3–5]. Працягам планамернага вывучэння могільніка сталі раскопкі 2013 г.

**Асноўная частка. Апісанне могільніка і гісторыя яго археалагічнага вывучэння.** Грунтовы могільнік каля в. Івесь густа парос лесам і хмызняком. Рэльеф мясцовасці ў асноўным роўны, з нязначнымі перападамі вышынь. На поўдзень ад грунтовага могільніка знаходзіцца курганная група. Заўважаны шэрагі магіл па лініі «поўнач – поўдзень», магілы арыентаваны па лініі «ўсход – захад». Магільныя насыпы адсутнічаюць. Прасочваюцца надмагільныя канструкцыі ў выглядзе задзернаваных каменных абкладак і буйных валуноў у галавах/нагах пахаванняў. На некаторых валунах высечаны крыжы [3, с. 379].

Найбольшая колькасць візуальна заўважных надмагільных камянёў была сканцэнтравана на пляцоўцы плошчай каля 400 м$^2$, якая ў 2010 г. была ачышчана ад хмызняку і мінулагодняга лісця. На пляцоўцы ў 2010 г быў закладзены шурф плошчай 12 м$^2$, пры даследаванні якога было ўскрыта 4 пахаванні [3]. У 2011 г. на пляцоўцы быў закладзены шурф плошчай 22,5 м$^2$ і даследавана 7 пахаванняў [4]. У 2012 г. на могільніку было закладзена 2 раскопа агульнай плошчай 37,75 м$^2$ і даследавана 5 пахаванняў [5]. Такім чынам, у 2010–2012 гг. на могільніку было ўскрыта 72,25 м$^2$ плошчы. Шурф 2011 г. і раскопы 2012 г. прыразаліся да шурфа 2010 г., што дазваляе разглядаць усю ўскрытую плошчу як адзін раскоп.

Пахаванні былі пазначаны каменнымі надмагіллямі ў выглядзе задзернаваных абкладак магілы па перыметры і суцэльных вымастак, у тым ліку з вялікімі валунамі ў галавах/нагах. Касцякі арыентаваны галавой на захад, у некаторых выпадках – з невялікімі адхіленнямі да поўначы і поўдня [3–5]. Антрапалагічную экспертызу астэалагічнага матэрыялу раскопак 2010–2012 гг. праводзіла кандыдат біялагічных навук, дацэнт В.А. Емяльянчык [6, с. 125–126].

З шаснаццаці даследаваных у 2010–2012 гг. пахаванняў толькі 2 мелі пахавальны інвентар, прадстаўлены чатырнаццаццю тонкімі бляшкамі-накладкамі XII–XIV стст. з сярэбранага сплаву ад жаночага галаўнога ўбору і вузкапласцінчатым пярсцёнкам XIV–XV стст. з двайным рыфленнем з меднага сплаву [4, с. 422–423; 5, с. 389]. Акрамя таго, у адным пахаванні быў знойдзены прадмет з меднага сплаву ў выглядзе расплюшчанага з аднаго боку стрыжня, што нагадваў мініяцюрны меч [3, с. 382]. У верхніх пластах культурнага слою могільніка былі выяўлены фрагменты сценак, венцаў і донцаў познесярэднявечнага керамічнага посуду, якія інтэрпрэтуецца як памінальны інвентар [3–].

**Апісанне раскопа 2013 г.** Археалагічныя раскопкі на могільніку каля в. Івесь у 2013 г. праводзіліся сіламі валанцёраў з ліку студэнтаў, магістрантаў і выпускнікоў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Актыўны ўдзел у раскопках і камеральнай апрацоўцы рэчавага матэрыялу прымаў выкладчык кафедры гісторыі А.Л. Коц.[1] У 2013 г. на расчышчанай у 2010 г. пляцоўцы намі быў закладзены раскоп першапачатковай плошчай 28 $м^2$, які прымыкаў з паўночнага боку да раскопа 2 2012 г. (мал. 1). Паміж раскопам 2 2012 г. і раскопам 2013 г. засталася недаследаванай плошча 2 $м^2$, занятая дубам, высякаць які ўяўлялася немагчымым. На планах недаследаваны ўчастак у 2 $м^2$ пазначаны шэрым колерам. У працэсе раскопак былі выяўлены пахаванні, што выходзілі за межы першапачатковага раскопа. Таму ў паўночна-заходнім куце была зроблена прырэзка плошчай 6 $м^2$. Агульная ўскрытая ў 2013 г. плошча склала такім чынам 34 $м^2$.




**Малюнак 1. – Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на. 2013 г.**
**Каменныя канструкцыі на ўзроўні дзённай паверхні**

Была працягнута нумарацыя квадратаў, пачатая ў 2010 г. У межах раскопа 2013 г. размяшчаліся квадраты А9, А10, Б9, Б10, А′10, А′11 цалкам, квадраты А8, А11, Б8, Б11, А′8, А′9 – часткова (гл. мал. 1). Пахаванні нумараваліся з пазначэннем года (2013) у парадку выяўлення ад 2013-1 да 2013-7. Усяго было выяўлена 7 пахаванняў.

Візуальны агляд і нівеліроўка дзённай паверхні раскопа выявілі нязначны перапад вышынь паміж паўночна-ўсходнім кутом раскопа і астатняй яго плошчай (розніца ў 0,2–0,3 м).

Размяшчэнне камянёў надмагільных канструкцый у межах раскопа на ўзроўні дзённай паверхні дазваляла меркаваць наяўнасць там 4–5 пахаванняў, пры гэтым валунныя камяні маглі разглядацца як маркеры галавы/ног пахавання (гл. мал. 1). На самой справе было выяўлена 7 пахаванняў.

На ўзроўні дзённай паверхні ў паўночна-ўсходняй частцы раскопа ў квадратах Б10–Б11 знаходзілася 8 камянёў памерамі ад 0,1 да 0,6 м (гл. мал. 1). Камяні ўтваралі абкладку магілы па перыметры. Абкладка была арыентаваная па лініі «паўночны захад – паўднёвы ўсход». У пласце 1 (глыбіня 0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) канструкцыя набыла выгляд суцэльнай вымасткі з 21 каменя памерамі 0,1–0,6 м (мал. 2). У пласце 2 (0,4 м ад узроўня дзёнай паверхні) выявіліся яшчэ 8 камянёў памерамі 0,1–0,3 м (мал. 3). У пласце 3 (0,6 м ад узроўня дзённай паверхні) зафіксаваны ячшэ 1 камень (мал. 4). У пласце 4 (0,8 м ад узроўня дзённай паверхні) выявілася 18 камянёў памерамі

[1] Аўтар выказвае падзяку выкладчыку кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістру гістарычных навук Аляксею Леанідавічу Коцу за ўдзел у археалагічных раскопках і камеральнай апрацоўцы рэчавага матэрыялу.

0,05–0,2 м (мал. 5). Камяні ў пластах 2–4 размешчаны хаатычна і без камянёў на ўзроўні дзённай паверхні і ў пласце 1 не даюць уяўлення аб характары надмагільнай канструкцыі. Пад згаданымі камянямі было выяўлена пахаванне 2013-2.




**Малюнак 2. – Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на. 2013 г. Каменныя канструкцыі пласта 1**




**Малюнак 3. – Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на. 2013 г. Каменныя канструкцыі пласта 2**

У паўднёва-ўсходняй частцы раскопа ў квадратах Б9–Б8 на ўзроўні дзённай паверхні знаходзілася 4 камяні памерамі 0,3–0,85 м (гл. мал. 1). Самы вялікі камень маркіраваў галаву пахавання і меў высечаны з заходняга боку крыж. У пласце 1 (0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) камянёў выяўлена не было, аднак у пласце 2 (0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) выявілася суцэльная вымастка з 28 камянёў памерамі 0,1–0,5 м, арыентаваная па лініі «паўночны захад – паўднёвы ўсход» (гл. мал. 3). У пласце 3 (0,6 м ад узроўня дзённай паверхні) было выяўлена ячшэ 10 камянёў (мал. 4), у пласце 4 (0,8 м ад узроўня дзённай паверхні) – 2 камяні памерамі ад 0,05 да 0,25 м (мал. 5). Каменная канструкцыя аналагічная папярэдняй. Пад ёй выяўлена пахаванне 2013-3.




**Малюнак 4. – Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на. 2013 г. Каменныя канструкцыі пласта 3**




**Малюнак 5. – Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на. 2013 г. Каменныя канструкцыі пласта 4**

У паўднёвай частцы раскопа ў квадратах А8–А9 на ўзроўні дзённай паверхні знаходзілася 4 камяні памерамі ад 0,2 да 0,85 м (гл. мал. 1). У пласце 1 (0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) камянёў выяўлена не было. У пласце 2 (0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) зафіксавана 4 камяня (гл. мал. 3), у пласце 4 (0,8 м ад узроўня дзённай паверхні) – 8 камянёў памерамі 0,1–0,3 м (гл. мал. 5). Каменная канструкцыя можа быць вызначана як вымастка з вялікім камянём у нагах пахавання. Пад ёй выяўлена пахаванне 2013-4.

У паўночна-заходняй частцы раскопа ў квадратах А10, А11, А′10, А′11 на ўзроўні дзённай паверхні знаходзілася 7 камянёў памерамі 0,2–0,8 м (гл. мал. 1). У пласце 1 (0,2 м ад узроўня дзённай паверхні) камянёў выяўлена не было. У пласце 2 (0,4 м ад узроўня дзённай паверхні) выявілася вялікая колькасць камянёў памерамі 0,05–0,6 м, якія складалі суцэльную вымастку (гл. мал. 3). Паколькі пад ёй было выяўлена 3 пахаванні: 2013-1, 2013-6 і 2013-7 – згаданая канструкцыя ўяўляла сабой вымасткі трох пахаванняў, дакладнае размежаванне якіх уяўляецца праблематычным.

У межах раскопа 2013 г. стратыграфія мела наступны выгляд. Пад слоем дзёрну на глыбіню 0,2–0,4 м ішоў пласт шэра-жоўтага, попелападобнага па структуры пяску, падзолу. Глыбей залягаў пласт жоўтага пяску магутнасцю 0,3–0,5 м. На глыбіні 0,5–0,8 м ад дзённай паверхні знаходзіўся слой мацерыковага шчыльнага пяску бледна-жоўтага колеру. Магільныя ямы былі запоўнены шэрым пяском. Стратыграфія раскопа 2013 г. суадносіцца са стратыграфіяй шурфоў 2010–2011 гг. і раскопаў 1–2 2012 г.

**Пахаванні.** *Пахаванне 2013-1* (мал. 6) размяшчалася ў заходняй частцы раскопа ў квадраце А′11 на глыбіні 0,62 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны галавой на паўночны захад. Правая рука пакладзена на грудзі, левая – на жывот. Антрапалагічную экспертызу костных парэшткаў праводзіла кандыдат біялагічных навук, дацэнт В.А. Емяльянчык.[2] У адпаведнасці з высновамі антрапалагічнай экспертызы ўзрост пахаванага складае 50 або болей гадоў, пол вызначыць не ўдалося з прычыны нездавальняючай захаванасці костных парэшткаў.




**Малюнак 6. – Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на. 2013 г. План размяшчэння пахаванняў**

*Пахаванне 2013-2* (гл. мал. 6) размяшчалася ў паўночна-ўсходняй частцы раскопа ў квадратах Б10–Б11 на глыбіні 0,82 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Правая рука пакладзена на грудзі, левая – на жывот. Паводле даных антрапалагічнай экспертызы пахаванне належыць мужчыне ва ўзросце ад 50 гадоў.

[2] Аўтар выказвае падзяку в.а. загадчыка кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, канд. біял. навук, дацэнту Вользе Антонаўне Емяльянчык за праведзеную антрапалагічную экспертызу костных парэшткаў.

*Пахаванне 2013-3* (гл. мал. 6) размяшчалася ў паўднёва-ўсходняй частцы раскопа ў квадраце Б9 на глыбіні 0,7 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны на паўночны захад. Рукі складзены на тазавых костках, правая на левай. Па высновах антрапалагічнай экспертызы пахаванне належыць мужчыне ва ўзросце 20–25 гадоў.

*Пахаванне 2013-4* (гл. мал. 6) размяшчалася ў паўднёва-заходняй частцы раскопа ў квадраце А′9 на глыбіні 0,69 м ад узроўня дзённай паверхні. Касцяк арыентаваны на паўночны захад. Левая рука пакладзена на грудзі, правая знаходзіцца на тазавых костках. Паводле антрапалагічнай экспертызы пахаванне належыць мужчыне ва ўзросце ад 50 гадоў.

*Пахаванне 2013-5* (гл. мал. 6) размяшчалася ў паўночна-заходняй частцы раскопа ў квадраце А′11 на глыбіні 0,56 м ад узроўня дзённай паверхні. Ад касцяка захаваліся толькі фрагменты чэрапа. Па даных антрапалагічнай экспертызы пахаванне з’яўляецца дзіцячым, узрост пахаванага – 4 гады. Пахаванне мае інвентар – завушніцы (мал. 7), – таму належыць дзяўчынцы.

*Пахаванне 2013-6* (гл. мал. 6) размяшчалася ў паўднёва-заходняй частцы раскопа ў квадраце А′9 на глыбіні 0,58 м ад узроўня дзённай паверхні. Ад касцяка захаваліся толькі фрагменты чэрапа, сам касцяк быў пашкоджаны каранямі дрэва. Паводле антрапалагічнай экспертызы пахаваны меў узрост ад 50 гадоў. Пол вызначыць немагчыма з прычыны адсутнасці костных парэшткаў.

*Пахаванне 2013-7* (гл. мал. 6) размяшчалася ў заходняй частцы раскопа ў квадраце А′10 на глыбіні 0,48 м ад узроўня дзённай паверхні. Ад касцяка захаваліся толькі фрагменты чэрапа. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы пахаванне з’яўляецца дзіцячым, узрост пахаванага – 5 гадоў.

Звяртае ўвагу арыентыроўка пахаванняў 2013-1, 2013-3, 2013-4. Пахаванні маюць моцнае адхіленне на поўнач, асабліва ў выпадку пахаванняў 2013-1 і 2013-3, што фіксуецца на могільніку каля в. Івесь упершыню.

**Знаходкі.** Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены:

– дзвюмя завушніцамі з дзіцячага пахавання 2013-5 (гл. мал. 7). Завушніцы зроблены з меднага або бронзавага дроту і маюць выгляд пытальніка. Адна завушніца мае пашкоджаную пятлю. Рэшткаў прыесак не выяўлена, хаця наяўнасць пятлі ўказвае на іх першапачатковую наяўнасць. Завушніцы датуюцца XV–XVI стст.

– каванымі цвікамі ад трун з пахаванняў 2013-1, 2013-2, 2013-3, 2013-4 (31 пазіцыя) Аналагічныя цвікі былі выяўлены на могільніку ў ходзе папярэдніх раскопак.




**Малюнак 7. – Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на. 2013 г. Інвентар пахавання 2013-5 (завушніцы)**

Пазамагільны інвентар прадстаўлены фрагментамі познесярэднявечнай керамікі (7 пазіцый), у тым ліку масіўнай ручкай ад керамічнай накрыўкі. Кераміка выяўлена ў пластах 1–3 культурнага слою. Паверхня фрагментаў керамічнага посуду шурпатая, неахайна загладжана. Цеста неаднароднае, з дамешкамі жарствы. Аналагічная кераміка была выяўлена на могільніку каля в. Івесь у 2010–2012 гг. [3–5]. Керамічны матэрыял у верхніх пластах культурнага слою могільніка Івесь суадносіцца з практыкай абрадавага памінання памерлых на могілках у ходзе «трацін», «прыкладзінаў», прымеркаванага да восеньскіх Дзядоў ці Радаўніцы ўпарадкавання магілы [7, с. 385; 8, с. 414–416; 9, с. 148–149]. Аналагічны памінальны інвентар прысутнічае на шэрагу іншых познесярэднявечных могільнікаў Беларускага Падзвіння: каля вв. Туржэц 2 Полацкага, Доўгае Глыбоцкага, Жарнасекава і Клешчыно Бешанковіцкага, Дубраўка Гарадоцкага раёнаў [10, с. 266; 11, с. 45–46].

**Заключэнне.** У 2013 г. намі было працягнута археалагічнае вывучэнне могільніка каля в. Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Да шурфоў і раскопаў 2010–2012 гг.быў прырэзаны раскоп плошчай 34 м$^2$. Агульная плошча, ускрытая на могільніку за ўвесь перыяд яго вывучэння, склала 106,25 м$^2$. Пераважнай формай надмагільных канструкцый, даследаваных у 2013 г., з’яўляюцца суцэльныя вымасткі магіл з вялікімі валунамі ў галавах/нагах пахавання. У ходзе раскопак выяўлена 7 пахаванняў, у тым ліку 3 мужчынскіх, 2 дзіцячых і 2 пахаванні дарослых людзей, пол якіх не быў устаноўлены з прычыны нездавальняючай захаванасці костных парэшткаў. Агульная колькасць пахаванняў, даследаваных на могільніку ў 2010–2013 гг., склала 23. Арыентыроўка касцякоў была вызначана ў чатырох выпадках. Два шкілеты арыентаваны галавой на захад з істотным адхіленнем да поўначы, два – на паўночны захад, што зафіксавана на могільніку ўпершыню. Рукі пахаваных пакладзены на грудзі,

жывот або тазавыя косткі (палажэнне рук прасочана ў чатырох пахаваннях), што суадносіцца з данымі археалагічнага вывучэння 2010–2012 гг.

У чатырох пахаваннях выяўлены каваныя цвікі ад трун. У адным пахаванні (2013-5) знойдзены пахавальны інвентар, прадстаўлены дзвюмя завушніцамі з меднага або бронзавага дроту ў выглядзе пытальніка. Завушніцы датуюцца XV–XVI стст. і з’яўляюцца трэцяй ювелірнай знаходкай, выяўленай на могільніку ў 2010–2013 гг. у 23 даследаваных пахаваннях. Завушніцы пацвярджаюць вызначаны раней дыяпазон функцыянавання могільніка (XIV–XVI стст.).

Выяўлены ў верхніх пластах культурнага слою могільніка Івесь кераміка суадносіцца з практыкай рытуальнага памінання памерлых на могілках, зафіксаванай этнаграфічна, і сведчыць аб ажыццяўленні аналагічных абрадавых дзеянняў у познім сярэднявеччы.

ЛІТАРАТУРА

1. Клімаў, М.В. Лучанскі грунтовы могільнік 1 / М.В. Клімаў // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навуковых канферэнцый / рэдкал.: Г.У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка, 2013. – С. 20–23.

2. Чараўко, В.У. Пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стагоддзяў: вызначэнне, структура і класіфікацыя / В.У. Чараўко // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2012. – № 1. – С. 24–27.

3. Чараўко, В.У. Археалагічныя разведкі на грунтовым могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2010 годзе / В.У. Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2012. – Вып. 23. – С. 379–383.

4. Чараўко, В.У. Археалагічнае вывучэнне могільніка каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2011 г. / В.У. Чараўко // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 20–23 мая 2012 г. ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.] ; навук. рэд., уклад. В.М. Ляўко. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – С. 417–426.

5. Чараўко, В.У. Археалагічныя раскопкі на могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2012 г. / В.У. Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2014. – Вып. 25. – С. 382–389.

6. Емельянчик, О.А. Краниологическая характеристика населения XIV–XVI вв. / О.А. Емельянчик // Палеоантропология Беларуси / И.И. Саливон [и др.] ; науч. ред. И.И. Саливон, С.В. Васильнев. – Минск : Беларус. навука, 2015. – С. 123–127.

7. Васілевіч, У.А. Памінкі / У.А. Васілевіч // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя ; рэдкал. : І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 385.

8. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У.А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. — 510 с.

9. Аўсейчык, У.Я. Абрад «прыкладзіны» ў беларусаў Падзвіння / У.Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. ІІ Міжнар. навук. Канф.і (да 20-годдзя археалагічных і этнаграфічных экспедыцый ПДУ), Полацк, 17–18 крас. 2014 г. : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – Ч. 1. – С. 144–156.

10. Дук, Д.У. Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна / Д.У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2008. – № 15. – С. 261–269.

11. Чараўко, В.У. Пазамагільны інвентар вясковых пахаванняў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.: наменклатура, інфарматыўнасць, інтэрпрэтацыя / В.У. Чараўко // Тэзісы навукова-краязнаўчай канферэнцыі да 90-годдзя Краязнаўчага музея Полацка, Полацк, 7–8 снежня 2016 г. / уклад. І.П. Воднева. – Полацк : НПГКМЗ, 2016. – С. 45–46.

*Пастуціў 13.12.2016*

## THE EXCAVATIONS AT THE CEMETERY NEAR IVES VILLAGE OF GLUBOKSKY DISTRICT IN 2013

***V. CHARAUKO***

*The article describes archaeological excavations at the ground cemetery near Ives village of Gluboksky district in Vitebsk region in 2013. The aim of the excavations is to continue the investigation of the funerary burials, which were started in 2010. The area opened in 2013 was 36 m$^2$. The stratigraphy of excavation pits correlats with the stratigraphy of pits of 2010–2012. 7 burials (2 children, 3 men and 2 people, whose sex could not be determined) were open. Funerary complexes were marked with gravestone constructions. The heads of skeletons are oriented to the Northwest (for the first time at the ground cemetery near Ives village) and to the West, with small deviations to the north. Coffin nails have been found in four burials. Two earrings, typical for the 15$^{th}$–16$^{th}$ centuries, have been found in the children grave.*

***Keywords:*** *Belarusian Dvina region, archaeological research, funerary monuments of the 15$^{th}$–16$^{th}$ centuries, grave goods, burials.*